# ГЕРОЙ ДНЯПРА
# ЗЛАЦІН ЯФІМ ІЗРАІЛЕВІЧ

**Нарадзіўся ў 1913 годзе ў Магілёве. Скончыў сем класаў. Працаваў пекарам. У 1935 годзе быў прызван у Чырвоную Армію. Ваенную службу праходзіў у родным горадзе. Пасля дэмабілізацыі працаваў у гандлі. Зноў быў прызван у Савецкую Армію ў 1942 годзе.**

**Званне Героя Савецкага Саюза лейтэнанту Я. І. Злаціну прысвоена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 23 кастрычніка 1943 года.**

**Памёр у Маскве у 1965 годзе.**

Гэта трывога ні на гадзіну не пакідала Яфіма Злаціна. У акупіраваным фашыстамі Магілёве засталіся ўсе яго родныя: бацька і маці, брат, сястра, жонка і двое дзяцей. Ён разумеў, якая доля магла іх спасцігнуць. І ўсё ж была нейкая маленькая надзея: можа ім удалося выйсці з горада, схавацца недзе ў вёсцы. З паведамленняў у друку ведаў аб жахлівых злачынствах фашыстаў на акупіраванай тэрыторыі. Ведаў, што яны не шкадавалі нават немаўлят. І ледзянела сэрца, калі ўяўляў, як гітлераўскія вылюдкі, наставіўшы аўтаматы, гоняць і яго дзяцей да глыбокага рова... Такое ўяўлялася часцей за ўсё.

Што можна зрабіць?.. . Разумеў толькі адно: спыніць асатанелага ворага, выбіць з яго рук зброю. І ён, бацька, павінен гэта зрабіць. На ім шынель воіна Чырвонай Арміі, у яго руках вінтоўка.

Ў баях пад Сталінградам радавы Злацін праявіў сябе як храбры і мужны воін. Прайшоу падрыхтоўку ў вучэбным батальёне, і яго назначылі камандзірам мінамётнага ўзвода ў стралковым палку. Мінамёт – грозная зброя, ён сваім навесным агнём дастане ворага там, дзе бяссільныя пушка і кулямёт. Сержант Злацін і яго падначаленыя навучыліся ў дасканаласці валодаць гэтай зброяй.

Мінамёты Злаціна білі па ворагу на Курскай дузе. Потым на подступах да Харкава. На грудзях камандзіра мінамётнага ўзвода ўжо два ордэны Чырвонай Зоркі.

У верасні 1943 года стралковы полк выйшаў да Дняпра ў ніжнім яго цячэнні. І хоць для Злаціна было ўсё роўна, дзе знішчаць ворага, толькі б хутчэй загнаць яго ў магілу, сустрэча з Дняпром вельмі ўзрадавала. Усё жыццё яго звязана з гэтай вялікай ракой. На Дняпры, у Магілёве, ён нарадзіўся, правёў дзіцячыя гады. Вучыўся. Потым пераехаў з бацькамі на Украіну. І таксама на Дняпро ў горад Днепрапятроўск.

З Днепрапятроўска праз некалькі год Злаціны вярнуліся на радзіму. У родным Магілёве Яфім працаваў пекарам на хлебазаводзе. Праходзіў службу ў Чырвонай Арміі. Пасля службы атрымаў рабогу ва універсальным магазіне № 15 гарпрамгандлю. Гэта каля кінатэатра

"Чырвоная зорка". Загадваў секцыяй культтавараў. Ён любіў Дняпро. Умеў добра плаваць.

І вось зноў сустрэўся з роднай ракой. Сустрэўся ў суровы ваенны час. На левым беразе яго мінамётчы ўзвод, яго стралковы полк, яго Савецкая Армія. На правым – вораг.

"Чуден Днепр прн тихой погоде ... Редкая птица долетит до середины его..." Успомніліся паэтычныя радкі Гогаля.

Але пагода... не ціхая. Няспынна рвуцца снарады. Бурліць ад выбухаў хуткае шырокае цячэнне. І ў гэтай бурлівай вадзе ён, Яфім Злацін і яго сябры. Мінамёты пагружаны на хісткія плыты. Плывуць байцы, трымаюцца за плыты, падпіхваюць іх уперад. Плывуць пехацінцы, сувязісты. Але не ўсе "далятаюць", як гогалеўская птушка, да сярэдзіны Дняпра.

Мінамётчыкі пераправіліся з першымі штурмуючымі групамі пяхоты. Жорсткія баі на захопленым плацдарме, невялікім кавалку правабярэжнай Украіны. Гэты кавалак, гэтую драбніцу трэба ўтрымаць нават цаной жыцця. Вораг не хоча прымірыцца з прысутнасцю савецкіх воінаў на правым беразе. Контратакі следуюць адна за адной. Усё менш абаронцаў плацдарма. На зыходзе міны.

– Ля мінамётаў заставацца толькі наводчыкам. Астатнія – у перадавыя акопы! – перапаўзаючы ад мінамёта да мінамёта, распараджаўся Злацін.

Калі адбівалі апошнюю з дзевяці контратак, Злацін ужо не чуў выбухаў, і нічога не чуў. Нават свайго голасу. Ён быў цяжка кантужан. І толькі бачыў, як на бераг успаўзалі нашы пехацінцы: прыбывала падмацаванне.

На адваяваным правым беразе Дняпра Яфім Злацін быў прынят у рады Камуністычнай партыі. І ў той жа час, у кастрычніку 1943 года за подзвіг на Дняпру яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Ужо калі Злацін вучыўся ў ленінградскім ваенна-палітычным вучылішчы імя Энгельса (лета 1944 года), даведаўся аб вызваленні Магілёва. І разам з радасцю – вялікае гора: фашысты ў ліку многіх тысяч савецкіх людзей знішчылі ўсю яго сям’ю і бацькоў. Пасля раненняў і кантузій гэта была нічым не вылечваемая глыбокая душэўная рана.

Лейтэнант Злацін зноў на перадавой, ён парторг аднаго з артылерыйскіх дывізіёнаў на 2-м Украінскім фронце. Удзельнічаў у Яска-Кішынёўскай аперацыі, у вызваленні Румыніі, Венгрыі і Чэхаславакіі.

Пасля вайны Я. І. Злацін працаваў у Маскве. Памёр у 1965 годзе.

Магілёў ганарыцца сваім земляком, імя якога назаўсёды застанецца ў гераічным летапісе Вялікай Айчыннай вайны.

**Герой Дняпра // Магілёўская праўда. — 1970. — 14 лютага. — С. 4.**